# ПРАВОСЛАВИЕ В ДУХОВНОЙ ЖИЗНИ БЕЛАРУСИ



Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

Брестская епархия
Белорусской Православной Церкви

# ПРАВОСЛАВИЕ В ДУХОВНОЙ ЖИЗНИ БЕЛАРУСИ

Сборник материалов
II Международной научно-практической конференции

Брест, 4–5 мая 2011 года

Брест
БрГУ имени А.С. Пушкина
2012

УДК 271.2 (091)+94 (438+47+476+477)+930.85 (476)
ББК 86.372
П 68

*Рекомендовано редакционно-издательским советом учреждения образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»*

*Рецензенты:*
доктор исторических наук, профессор
**В.И. Новицкий**
кандидат философских наук, доцент
**В.В. Старостенко**

*Редакционная коллегия:*
доктор исторических наук, профессор **М.Э. Чесновский**
доктор исторических наук, профессор **А.А. Горбацкий**
доктор исторических наук, доцент **А.Н. Вабищевич**
кандидат исторических наук **А.Н. Свирид**

П 68 **Православие** в духовной жизни Беларуси : сборник материалов II Междунар. науч.-практ. конф. ; Брест, 4–5 мая 2011 г. / Брест. гос. ун-т имени А.С. Пушкина ; редкол.: М.Э. Чесновский [и др.]. – Брест : БрГУ, 2012. – 156 с.
ISBN 978-985-473-817-8.

В сборнике представлены доклады II Международной научно-практической конференции «Православие в духовной жизни Беларуси», посвященные истории Православной Церкви на территории Беларуси, роли Церкви в культуре и нравственном здоровье нации.

Издание адресовано научным работникам, ученым, священнослужителям, работникам органов государственного управления, преподавателям, студентам.

Ответственность за языковое оформление и содержание статей несут авторы.

**УДК 271.2 (091)+94 (438+47+476+477)+930.85 (476)**
**ББК 86.372**

**ISBN 978-985-473-817-8**

© УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», 2012

Тое, што было зроблена ў антырэлігійнай палітыцы і практыцы ў другой палове 1920-х гг., працягвала курс савецкага праўлення папярэдняга часу ў напрамку барацьбы з рэлігіяй, нягледзячы на аднаўленне на аснове нэпа гаспадаркі і матэрыяльнай базы культуры. Такім чынам, эканамічныя зрухі не аказвалі ўздзеяння на характар і накіраванасць партыйна-дзяржаўнага стаўлення да рэлігіі. Гэта была магістральная, доўгатэрміновая лінія, разлічаная на многія дзесяцігоддзі. Яна з'яўлялася ў пэўнай ступені аўтаномнай, аднак была цесна звязана з характарам бальшавіцкай улады, яе эвалюцыяй па шляху да адміністрацыйна-каманднага, аўтарытарнага праўлення.

1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2006. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. – 613 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4-п. – Воп. 3. – Спр. 17. – Арк. 40.
3. НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 21. – Спр. 69. – Арк. 395.
4. НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 3. – Спр. 14. – Арк. 89.
5. НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 5. – Спр. 612. – Арк. 26.
6. НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 3. – Спр. 17. – Арк. 40-41.
7. НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 21. – Спр. 69. – Арк. 396.
8. НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 5. – Спр. 612. – Арк. 26.
9. НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 3. – Спр. 17. – Арк. 42; Воп. 21. – Спр. 69. – Арк. 395; Воп. 5. – Спр. 612. – Арк. 26.
10. НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 3. – Спр. 14. – Арк. 89; Воп. 5. – Спр. 612. – Арк. 26.

УДК 94 (476) "1921/1939"
**А.М. Вабішчэвіч (Брэст)**

## ПРАВАСЛАЎНАЕ ДУХАВЕНСТВА Ў КАНТЭКСЦЕ ПРАБЛЕМАТЫКІ ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ЗАХАВАННЯ ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў 1921–1939 ГГ.

Праваслаўныя, якія з'яўляліся пераважнай большасцю сярод беларусаў, былі расселены па ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі, аднак найбольшая іх прысутнасць назіралася ў Палескім ваяводстве – 76,5 % яго насельніцтва (1931 г.) [1, с. 43]. Калі паступовае падпарадкаванне царкоўнай структуры Польскай дзяржаве непасрэдна не закранала інтарэсы большасці праваслаўных беларусаў, то гвалтоўныя акцыі надавалі канфрантацыйны характар іх адносінам да польскіх улад і Рымска-каталіцкай Царквы. Асабліва негатыўныя вынікі мела рэвіндыкацыя маёмасці Праваслаўнай Царквы, якая не толькі падарвала яе эканамічныя пазіцыі, але і нанесла адчувальны ўрон гісторыка-культурнай спадчыне. З 278 праваслаўных манастыроў, цэркваў, капліц, якія падвергліся рэвіндыкацыі ў 1918–1930 гг., у Віленскім ваяводстве было 40, Беластоцкім – 32, Навагрудскім – 28, Палескім – 19 (паводле іншых звестак – 16) [2, арк. 14; 3, с. 81]. У канцы 1920-х – першай палове 1930-х гг. назіралася хваля масіраваных судовых разбіральніцтваў – пададзена 755 іскавых заяў, з іх на заходнебеларускія епархіі прыходзілася 478 (у тым ліку на Палескую – 248). У ходзе рэвіндыкацыі ў адабраных праваслаўных храмах ламаліся іканастасы, знішчаліся творы скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, адбываліся акты вандалізму на могілках.

На ўзроўні праваслаўных прыходаў духавенства, пераважна рускае па нацыянальнай прыналежнасці, якое атрымала адукацыю яшчэ ў дарэвалюцыйнай

Расійскай імперыі, працягвала прытрымлівацца папярэдніх культурна-моўных традыцый. Руская мова выкарыстоўвалася ім у царкоўным жыцці і ў кантактах з вернікамі. Пра гэта сведчаць як архіўныя крыніцы, так і ўспаміны заходнебеларускіх жыхароў [4]. Аднак нельга было не ўлічваць таго, што беларуская мова з'яўлялася мовай кантактаў паміж праваслаўнымі вернікамі. Таму ў многіх мясцовасцях духавенства выкарыстоўвала беларускую мову ў якасці дапаможнай у адносінах з людзьмі, пры навучанні дзяцей, што было дазволена як адпаведнымі рашэннямі св. Сінода ў Варшаве 1922–1924 гг., так і распараджэннем міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы ад 18 лютага 1927 г. Аналіз стану вывучэння Закону Божага ў Віленскай епархіі ў 1928 г. паказвае, што з 668 анкетаваных школ (33 826 дзяцей) у большасці гэта адбывалася па-беларуску [5, с. 11–15]. Пад уплывам духавенства вернікі праяўлялі негатыўнае стаўленне да польскай асветы, нярэдка ўздымалі пытанне аб неабходнасці беларускіх школ.

У сярэдзіне 1930-х гг., калі пад уздзеяннем дзяржаўных улад Праваслаўная Царква ўцягвалася ў дэрусіфікацыю і паланізацыю грамадска-царкоўнага жыцця, ад духавенства дамагаліся польскамоўнага выкладання Закону Божага, пропаведзяў па-польску (абавязкова ў час дзяржаўных святаў), у выпадку адмовы выкарыстоўваліся як рэпрэсіўныя адміністрацыйна-паліцэйскія меры, так і затрымкі дзяржаўных датацый. І гэта пры тым, што матэрыяльны дастатак духавенства быў слабым.

Як сведчаць успаміны заходнебеларускіх жыхароў, пашырэнне польскага ўплыву стала прыкметнай з'явай у грамадска-царкоўным жыцці: “пасля літургіі ў царкве таксама выконваліся песні на польскай мове”; “нават бацюшка стаў гаварыць па-польску” [6, с. 232, 209]. Значная частка духавенства (асабліва старэйшага пакалення) дрэнна валодала польскай мовай [7, арк. 9–10], таму ёй дазвалялася часова выкарыстоўваць мясцовыя дыялекты. Маладыя святары перавагу надавалі польскай мове. Дэрусіфікацыя праявілася ў забароне напісання кірылічным пісьмом імёнаў у метрыках (напрыклад, трэба было пісаць замест Фама – Томаш і г. д.). Яшчэ з пачатку 1920-х гг. праваслаўных іерархаў прымушалі прыняць рашэнне аб пераходзе з юліянскага календара на грыгарыянскі.

На старонках часопіса “Воскресное чтение” адзін са свяшчэннаслужыцеляў (называў сябе старым іярэям, а замест сапраўднага прозвішча падпісаўся крыптонімам “ЮСЪ”) надрукаваў урыўкі ўласнага дзённіка, у якім адначасова выказаў абурэнне акаталічваннем і паланізацыяй дзяцей праваслаўных беларускіх сялян у ходзе навучання Закону Божаму. Гвалтам над сумленнем праваслаўных дзяцей ён назваў замену іконы – звычайна – на Распяцце ці іншыя каталіцкія выявы: «если вы привыкли в течение ряда лет видеть в классной комнате православную икону, а затем она исчезает неведомо куда и заменяется для православных детей католической». Адбывалася паланізацыя прозвішчаў, імёнаў праваслаўных беларускіх дзяцей. «Берешь классный журнал, чтобы проверить по списку учеников, и опять натыкаешься на новые перлы религиозной и национальной узости и предвзятости: что ни фамилия, то сюрприз – Władysław Lutyński (подразумевай: Владимир Лютынский), Basia Korzeniewska (Варвара Кореневская), Szymon – вместо Семён, Janina – вместо Нина, Eliza – Елисавета, Szczepan – Стефан и т. д.». Яго сын так і не змог пераканаць школьнага настаўніка, што яго імя не Уладзіслаў, а Уладзімір. Той адказваў яму, што дома ён Уладзімір, а ў школе з'яўляецца Уладзіславам. Абурала свяшчэнаслужыцеля і

тое, што прадуманы і сістэматычны характар мела праца па развучванні школьнікамі ў калядны пост каталіцкіх песняў. Падкрэслівалася, што менавіта сям'я заставалася захавальніцай праваслаўных традыцый, звычаяў. «Церковного богослужения учащиеся не посещают, вернее, посещают постольку, поскольку приводят их в храм родители и воспитатели. Школа же устраняет от себя в этом отношении все заботы, ограничиваясь… тем только, чтобы дети присутствовали в церкви в дни общественных народных праздников… да на молебнах перед началом и в конце учебного года» [8, с. 707–708]. Безумоўна, што дадзенай публікацыяй, якая быццам была прыватным меркаваннем асобнага святара, рэдакцыя выдання пазіцыянiравала сваю пазіцыю супраць паланізацыі і дэрусіфікацыі царквы (інакш не адважылася бы яе друкаваць). Акрамя таго, выказаныя аўтарскія думкі фактычна трэба разглядаць у якасці меркаванняў пэўнай часткі праваслаўнага духавенства, якое не магло ў межах Польскай дзяржавы адкрыта выказаць сваю нязгоду.

Хоць і не масава, але былі выпадкі самакрытыкі з боку асобных святароў. Адносна планаў друкавання падручнікаў па Закону Божаму на лацінцы пратаіерэй А. Мірановіч у лісце ў рэдакцыю штотыднёвіка "Воскресное чтение" пісаў наступнае: «…православное духовенство не крест могильный должно поставить над кириллицей, а приложить достойное усердие к её сохранению» [9, с. 136].

Таксама ў мэтах паланізацыі царквы польскія ўлады інспіравалі рух "праваслаўных палякаў". Паводле заключэнняў польскіх даследчыкаў (Л. Васілеўскага, К. Сракоўскага і інш.), абсалютная большасць "праваслаўных палякаў" ахоплівала ўкраінцаў, беларусаў і рускіх. Частку актывістаў новага грамадскага руху складалі чыноўнікі праваслаўнага веравызнання, якіх падтрымліваў гродзенскі епіскап Сава (Саветаў). Арганізацыйная структура руху "праваслаўных палякаў", якая пачала ствараццa ў 1935 г., – таварыства "Праваслаўны дом імя Ю. Пілсудскага" ў Беластоку, а таксама аналагічныя аб'яднанні ў Гродне, Навагрудку, Валожыне, Слоніме, Баранавічах, Вільні [10] – была нацэлена на правядзенне прапольскай культурна-асветніцкай дзейнасці. Пры гэтым выказвалася варожасць у адносінах да рускай культуры, мовы. Для тэарэтыка-ідэалагічнага забеспячэння ў Гродне быў створаны Праваслаўны навукова-выдавецкі інстытут, адной з асноўных задач якога была дэкларававаная прапаганда супрацоўніцтва праваслаўных з Польскай дзяржавай, палякамі і іх культурай. Аднак нават пры наяўнасці пратэкцыяніцкіх мер з боку дзяржаўных структур рух "праваслаўных палякаў" не атрымаў шырокай грамадскай падтрымкі, асабліва з боку большасці прыходскага духавенства.

У пачатку 1939 г. у Палескай епархіі ўрокі рэлігіі выкладаліся ў школах на польскай мове. Запісы ў кнігах грамадзянскага стану, метрыках, унутраная перапіска, афіцыйныя дакументы епархіі, казанні ажыццяўляліся па-польску. Польскія ўлады планавалі ўзмацніць націск на праваслаўных іерархаў у справе прыняцця рашэння аб пераходзе на грыгарыянскі каляндар, адкрыць праваслаўную семінарыю і школу псаломшчыкаў у Пінску для навучання і выхавання там у польскім духу адпаведных кадраў [11, с. 83, 98]. Па ініцыятыве палескага ваяводы В. Костэк-Бярнацкага святары павінны былі падпісвацца пад пісьмовай прысягай аб лаяльнасці і паслухмянасці адносна дзяржаўнай адміністрацыі [12, арк. 43].

Нягледзячы на захады польскіх улад адносна паланізацыі Праваслаўнай Царквы, на ўзроўні прыходаў з боку праваслаўнага духавенства аказвалася

спрыянне захаванню традыцыйных каштоўнасцей беларусаў. У праваслаўных прыходах была прадэманстравана жыццяздольнасць рэлігійна-асветніцкага выхавання. Ва ўмовах адносна высокай ступені рэлігійнасці насельніцтва шырокай была практыка наведвання храмаў. Аналіз успамінаў заходнебеларускіх жыхароў дазваляе вылучыць тэндэнцыю росту аўтарытэту прыходскага праваслаўнага духавенства насуперак планаў далучэння царкоўных структур да паланізацыі і дэрусіфікацыі: “бацюшку паважалі і баяліся”, “бацюшку шанавалі”, “да папоў адносіліся як да пастыраў”, “у царкву хадзілі як на свята”, “у царкву ездзілі цэлымі сем’ямі на фурманках або санях” і інш. [4; 6, с. 226, 228–229, 230, 235–236; 13]. Прыходскае духавенства працягвала задавальняць інтарэсы людзей у сферы сямейна-шлюбных адносін. Акрамя паломніцтваў, збору ахвяраванняў, хрэсных ходаў, папулярнасцю ў мясцовага насельніцтва карысталіся прыходскія святы, кірмашы, прымеркаваныя да Прэабражэння, Пакроваў і іншых святаў.

Аднак прыходскае праваслаўнае духавенства не заўсёды рэўнасна выконвала свае пастырскія абавязкі. У адной з падарожных нататак на старонках штотыднёвіка “Воскресное чтение” праваслаўная пісьменніца С. Прорвіч папракала духавенства ў пасіўнасці: «Наши отцы духовные “избегают” нас, мирян, прячутся от нашего голоса трезвого, затыкают уши, покоясь в своей рутине: повенчал, покрестил, похоронил – довольно… дальше не могу» [14, с. 129]. Паводле ацэнкі сучаснага праваслаўнага свяшчэннаслужыцеля і краязнаўцы В.М. Туміловіча, які апублікаваў літаратурную спадчыну С. Прорвіч, яе патрыятычныя пачуцці, любоў да роднага краю былі пасля любві да Бога на другім месцы [15, с. 127].

У цэлым, нягледзячы на суб’ектыўны характар ацэнак стану і дзейнасці праваслаўнага духавенства на заходнебеларускіх землях у 1921–1939 гг. у гістарычных крыніцах (асабліва ў архіўных матэрыялах, успамінах), шырокае выкарыстанне розных метадалагічных падыходаў (сярод якіх не толькі метады гістарычных даследаванняў, але і кантэнт-аналіз, метад герменеўтыкі) дазваляе зрабіць пэўныя высновы. Па-першае, большасць праваслаўных свяшчэннікаў негатыўна ці стрымана рэагавала на планы паланізацыі Праваслаўнай Царквы. Па-другое, на ўзроўні прыходаў з боку праваслаўнага духавенства праяўляліся талерантныя адносіны да традыцыйных каштоўнасцей беларусаў. У культурна-моўным пытанні яно займала пераважна традыцыяналісцкія пазіцыі. Па-трэцяе, дзеля самазахавання духавенства вымушана было знешне захоўваць палітычную лаяльнасць адносна Польскай дзяржавы.


1. Mironowicz, E. Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku / E. Mironowicz, S. Tokć, R. Radzik. – Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2005. – 171 s.

2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 1. – Воп. 2. – Спр. 2087. Статыстычныя звесткі аб каталіцкіх храмах, якія займала праваслаўнае духавенства, заявы грамадзян аб вяртанні каталіцкіх храмаў (1930 г.).

3. Костюк, В. История Полесской епархии (1922–1944 гг.) / В. Костюк. – Брест: Обл. тип., 1999. – 149 с.

4. Запісы ўспамінаў жыхароў в. Рубель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці Вабішчэвіч В.А. (1932 г. нар.), Каляды М.А. (1927 г. нар.), Пашкевіч К.П. (1924 г. нар.), жыхара в. Еськавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці Новіка А.А. (1920–2008 гг.) (захоўваюцца ў прыватным архіве А.М. Вабішчэвіча).

5. Стан законавучыцельскай справы ў Віленскай епархіі ў 1928 г. // Беларуская зарніца. – 1928. – № 7–8. – С. 11–15.
6. У новай айчыне: штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў міжваенны перыяд. – Беласток: Праграмная рада тыднёвіка “Ніва”, 2001. – 301 с.
7. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2316. Звесткі аб мовах, якімі карыстаецца праваслаўнае духавенства (1933–1934 гг.).
8. [ЮСЪ]. Из дневника старого иерея // Воскресное чтение. – 1931. – 6 декабря (№ 49). – С. 706–709.
9. Миронович, А., протоиерей. По поводу решения печатать православные учебники по Закону Божию латинкой (Письмо в редакцию «Воскресного чтения» / А. Миронович // Воскресное чтение. – 1931. – 29 марта (№ 13). – С. 135–136.
10. Archiwum Akt Nowych w Warszawie. – Zespół 8. – Cz. VI. – Sygn. 148–263. Нататкa пра Саюз праваслаўных палякаў (1939 г.).
11. Polski stan posiadania na Polesiu. – Brześć nad Bugiem: B. w, 1939. – 110 s.
12. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 2331.
13. Запісы ўспамінаў жыхаркі в. Орля Бельскага павета (Польшча) Бажко М. (1919 г. нар.), жыхаркі в. Махнатае Бельскага павета (Польшча) Кучынскай Н. (1924 г. нар.), жыхара в. Карыціск Бельскага павета (Польшча) Янчука К. (1932 г. нар.) (захоўваюцца ў прыватным архіве А.М. Вабішчэвіча).
14. Прорвич, С. Матушка: Из путевых заметок / С. Прорвич // Воскресное чтение. – 1931. – 29 марта (№ 13). – С. 128–133.
15. Прорвич, С. Любили отцы наши Бога: сборник рассказов / С. Прорвич. – Минск: Белорусский Экзархат, 2004. – 130 с.

УДК 271.2 (476)
**О.П. Харченко (Брест)**

## ДУХОВЕНСТВО РУССКОЙ ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ В УСЛОВИЯХ СОВЕТИЗАЦИИ ЗАПАДНЫХ ОБЛАСТЕЙ БЕЛАРУСИ (сентябрь 1939 г. – июнь 1941 г.)

К началу Великой Отечественной войны отношения между государством и религиозными организациями в СССР были далеки от нормальных [9, с. 103]. Начальной вехой периода государственной политики в СССР (при всех ее колебаниях и изменениях) является окончательный отказ от существовавших в 1930-е гг. планов постепенного удушения церкви. Происходит существенная перестройка всех государственно-церковных отношений, превращение Московской патриархии в определенной степени в придаток государственного аппарата, начинается активное использование ее в целях внутренней и внешней политики. Ни самого местоблюстителя патриаршего престола митрополита Сергия, ни трех ближайших помощников не арестовали, а патриархию не уничтожили. Митрополит Сергий (Воскресенский), как непосредственный участник и свидетель церковной жизни предвоенных лет, объяснял это тем, что для советской власти важно было сохранить патриархию как орган высшего церковного управления «в целях рекламы и пропаганды», «как неоспоримое доказательство, что в советском государстве даже Православная Церковь, опора реакции царизма, пользуется религиозной свободой» [19, с. 255–256].

Продвижение границ Советского государства на запад в сентябре 1939 г. расширило юрисдикцию РПЦ, т.к. именно в западных областях находилось примерно 90 % всех приходов Православной Церкви. Большая часть православного населения, примерно 4 млн. человек, оказалась на территории советской Беларуси и Украины [19, с. 246]. Здесь были епархии – Гродненская, Полесская, Вилен-